*Д. А. Доўгаль, настаўнік Славянскай гімназіі г. Бабруйска*

# ВЫНІКОВЫ ТЭСТ ПА БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ (X клас, павышаны і паглыблены ўзроўні)

## Частка А

**Падкрэсліце правільны адказ — «так» або «не».**

| | | |
|---|---|---|
| A1 | Мігель дэ Сервантэс задумваў «Дон Кіхота» як пародыю на рыцарскія раманы | так/не |
| A2 | Дзеянне трагедыі Шэкспіра «Гамлет» адбываецца ў Англіі | так/не |
| A3 | А. Міцкевіч стварыў паэму «Пан Тадэвуш» у эміграцыі | так/не |
| A4 | Пяцікніжжа Майсея ўваходзіць у склад Старога Запавету | так/не |
| A5 | Шчадроўкі адносяцца да сямейна-абрадавай паэзіі | так/не |
| A6 | Паэма Байрана «Паломніцтва Чайльд Гарольда» ў значнай ступені твор аўтабіяграфічны | так/не |
| A7 | Э. Ажэшка была прэтэндэнткай на атрыманне Нобелеўскай прэміі ў галіне літаратуры | так/не |
| A8 | Важнай прыкметай барока як стылю ў мастацтве лічыцца яго складанасць, спалучэнне нечаканасцей, супастаўленне кантрастаў | так/не |
| A9 | Словы Р. Семашкевіча «На ўсю Беларусь мільён пракурораў // І толькі адзін, толькі ён адвакат» узяты з верша «Кастусь Каліноўскі» | так/не |
| A10 | Паэмы «Рамаяна» і «Махабхарата» — творы старажытнаегіпецкай літаратуры | так/не |

## Частка Б

**Выберыце і падкрэсліце адзін з чатырох прапанаваных варыянтаў адказу.**

**Б1.** Які з твораў адносіцца да травесційнай літаратуры?

«Пан Тадэвуш», «Энеіда навыварат», «Пінская шляхта», «Хам».

**Б2.** Рубаі — найбольш характэрная форма паэзіі:

Ф. Петраркі, А. Хаяма, Ду Фу, Авідзія.

**Б3.** Колькі кругоў у пекле «Боскай камедыі» Дантэ?

3, 4, 7, 9.

**Б4.** «Калі б у працы ўбачыў я заўсёднай // Народ свабодны на зямлі свабоднай, // Імгненню я б сказаў тады: "Цудоўнае, спыніся!"» Каму з літаратурных герояў належаць гэтыя словы?

Чайльд Гарольду, Фаўсту, Гамлету, Тадэвушу Сапліцу.

**Б5.** У гэтым творы распавядаецца пра вяртанне героя на родную Ітаку:

«Адысея», «Іліяда», «Энеіда», «Рамаяна».

**Б6.** Якая з прыведзеных асаблівасцей не характарызуе літаратуру эпохі Сярэднявечча?

Кананічнасць, жанравая аднастайнасць, ананімнасць, антыклерыкальнасць.

**Б7.** Вобраз жанчыны Плачкі ў раскрыцці ідэйнага зместу твора — удалая творчая знаходка:

В. Дуніна-Марцінкевіча, В. Каратынскага, У. Сыракомлі, Я. Баршчэўскага.

**Б8.** У 1562 годзе ў Нясвіжы на беларускай мове надрукаваў «Катэхізіс»:

Ф. Скарына, С. Будны, В. Цяпінскі, П. Мсціславец.

**Б9.** Выберыце сярод прапанаваных той напрамак, які прэзентуе нерэалістычнае мастацтва другой паловы XIX стагоддзя:

Рамантызм, сімвалізм, класіцызм, сентыменталізм.

**Б10.** Адзначце той жанр, які не з'яўляецца лірычным:

Мадрыгал, эпітафія, раманс, вадэвіль.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## Частка В

**Запішыце на месцы пропуску правільны адказ.**

**В1.** Кастусь Каліноўскі выдаў ____ нумароў газеты «Мужыцкая праўда».

**В2.** У Новы Запавет уваходзяць Евангеллі ад Мацвея, Іаана, Марка і ________.

**В3.** Пісьменнікі Дж. Ф. Купер, Ю. Славацкі, Э. Т. А. Гофман — прадстаўнікі эпохі ____________.

**В4.** У прадмове да якой біблейскай кнігі Ф. Скарына гаворыць: «Вось які галоўны вывад зрабіў ён [Саламон] у канцы: “Марнасць над марнасцю, усё марнае, нават — прыцясненне духоўнае!”» ________.

**В5.** Найбольш вядомай паэтэсай у старажытнагрэчаскай літаратуры з'яўляецца ____________.

**В6.** Гуманіст эпохі Адраджэння, прадстаўнік лацінамоўнай літаратуры, першаадкрывальнік жанру ліра-эпічнай паэмы ў літаратурах Усходняй Еўропы, выдатны дзеяч славянскай культуры. Пра яго У. Калеснік піша: «Паэт-дыпламат, умее паглядзець на сваю радзіму збоку, вачыма зарубежных палітыкаў, вучоных і купцоў». ____________________.

**В7.** В. Дунін-Марцінкевіч, Б. Тарашкевіч, П. Бітэль, Я. Семяжон у розны час перакладалі гэты твор на беларускую мову ________________________________.

**В8.** Дрэва-сімвал паэзіі Яніса Райніса — ____________________.

**В9.** Назва першага зборніка Ф. Багушэвіча — ________________.

**В10.** Расстаўце ў храналагічным парадку імёны пісьменнікаў:

__В. Дунін-Марцінкевіч __Я. Чачот __Янка Лучына __К. Марашэўскі

## Адказы

| | | |
|---|---|---|
| А1. ТАК | Б1. «Энеіда навыварат» | В1. 7 |
| А2. НЕ | Б2. А. Хаяма | В2. Лукі |
| А3. ТАК | Б3. 9 | В3. Рамантызму |
| А4. ТАК | Б4. Фаўсту | В4. «Эклезіяст» |
| А5. НЕ | Б5. «Адысея» | В5. Сапфо |
| А6. ТАК | Б6. Антыклерыкальнасць | В6. Мікола Гусоўскі |
| А7. ТАК | Б7. Я. Баршчэўскага | В7. «Пан Тадэвуш» |
| А8. ТАК | Б8. С. Будны | В8. Сасна |
| А9. НЕ | Б9. Сімвалізм | В9. «Дудка беларуская» |
| А10. НЕ | Б10. Вадэвіль | В10. К. Марашэўскі, Я. Чачот, В. Дунін-Марцінкевіч, Янка Лучына |

Правільны адказ на пытанне часткі А ацэньваецца двума баламі, часткі Б — трыма, часткі В — пяццю баламі. Такім чынам, максімальная сума балаў за выкананне тэста — 10.

| Колькасць балаў | Адзнака |
|---|---|
| 100—91 | 10 |
| 90—81 | 9 |
| 80—71 | 8 |
| 70—61 | 7 |
| 60—51 | 6 |
| 50—41 | 5 |
| 40—31 | 4 |
| 30—21 | 3 |
| 20—11 | 2 |
| 10—1 | 1 |

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова